# Экскурсія “Па мясцінах графа Чапскага”

Край мой родны, скажу без падману,
Куды б сцежкі твае ні вялі,
Я душой прыкіпеў да Ашмянаў –
Няма лепшай на свеце зямлі.
Пётр Шакола

Словы нашага мясцовага паэта Пятра Шаколы ляглі ў аснову экскурсійнай паездкі па мясцінах графа Чапскага, якая была праведзена для наведвальнікаў аддзялення дзеннага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту дзяржаўнай установы “Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раена”. У пачатку экскурсіі спецыяліст па сацыяльнай рабоце правяла аглядную экскурсію па Ашмянскім раёне, паведала прысутным аб яго гістарычных мясцінах і гістарычных постацях, якія ў свой час унеслі вялікі ўклад ў развіццё грамадства. Асаблівая ўвага была звернута на жыццёвы шлях Карла Эмерыкавіча Чапскага, на яго след у развіцці горада Мінска, добраўпарадкаванне памесця ў весцы Двор Наваселкі (зараз вёска Агароднікі) Ашмянскага раёна.

Першым прыпынкам на маршруце быў памятнік прыроды “Валун “Нявесцін камень”, дзе нас чакала тэатрэлізаванае прадстаўленне, арганізаванае работнікамі дзяржаўнай установы культуры “Ашмянскі раённы цэнтр культуры”. Вельмі цікава артысты прадставілі легенду пра гэты гістарычны аб’ект, арганізавалі народныя гульні і танцы, пазнаемілі з абрадамі, якія выконваюцца каля валуна, разам з прысутнымі павязалі стужачкі на дрэве жаданняў, пачаставалі гасцей духмяным чаем.

Далей экскурсанты завіталі ў былое памесце графа Чапскага ў весцы Агароднікі. На жаль, ад двухпавярховага будынка засталіся толькі руіны. Але ўсе мелі магчымасць разгледзіць пабудовы (канюшні), якія засталіся да сенняшняга часу, палюбавацца прыгажосцю прыроды, пасядзець на беразе возера, ў якім, па ўспамінах старажылаў, сам граф Чапскі лавіў рыбу, папіць цудоўнай вадзічкі з крыніцы, якая засталася тут з даўніх часоў, зрабіць прыгожыя фотаздымкі, проста пасядзець ў цішыні і паслухаць спеў птушак і звонкі пераліў ракі Ашмянкі.

У Барунах нашай увазе была прапанавана экскурсія ў гісторыка-краязнаўчы музей “Спадчына” дзяржаўнай установы адукацыі “Барунская сярэдняя школа”, знаемства з гісторыяй помніка летчыкам Першай сусветнай вайны, якія загінулі на тэрыторыі Барун, і на заканчэнне маршрута – наведванне касцела святых Пятра і Паўла. Кожны прысутны змог набраць ў касцеле крынічнай вады, перад цудатворным абразом Маці Божай Барунскай узнесці свае падзякі Найсвяцейшай панне Марыі, папрасіць яе аб здароўі для

сваіх родных, міру і супакою для нашай краіны, бо жыць у міры – гэта самае важнае, што можа быць на Зямлі.













